# ДРЭВЫ-ВОЛАТЫ БЕЛАРУСІ Ў КРАЯЗНАЎЧЫМ КІНАСЦЭНАРЫІ «СВЕДКІ ВЕЧНАСЦІ» УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

**В. В. Навіцкая**

*Магістр філалогіі,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*strahlbox@gmail.com*

У артыкуле раскрыты асаблівасці функцыянавання ў мастацкім свеце У. Караткевіча вобразаў унікальных помнікаў беларускай прыроды – шматсотгадовых дрэў-волатаў з Турава, Навагрудку, Свіцязі, Варончы, Туганавіч, Шчорсаў і інш. Ахарактарызавана асэнсаванне пісьменнікам быцця дрэў-старажылаў у кантэксце аддаленага гістарычнага часу і напрыканцы ХХ стагоддзя. Вызначана пазіцыянаванне гэтых вобразаў у сцэнарыі для дакументальнага кароткаметражнага фільма «Сведкі вечнасці», створанага У. Караткевічам, а таксама стаўленне пісьменніка да праблем экалогіі, зафіксаванае ў яго прыватных лістах.

***Ключавыя словы***: краязнаўства; дрэвы-помнікі прыроды; экалагічная праблематыка; патрыятычны пафас; кінасцэнарый.

# ДЕРЕВЬЯ-БОГАТЫРИ БЕЛАРУСИ В КРАЕВЕДЧЕСКОМ КИНОСЦЕНАРИИ «СВИДЕТЕЛИ ВЕЧНОСТИ» ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА

**В. В. Навицкая**

*Магистр филологии,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*strahlbox@gmail.com*

В статье раскрываются особенности функционирования в художественном мире В. Короткевича образов уникальных памятников белорусской природы – вековых деревьев-великанов из Турова, Новогрудка, Свитязи, Ворончи, Тугановичей, Щорса и др. Описывается осмысление писателем существования деревьев-старожилов в контексте далекого исторического времени и в конце ХХ века. Определено позиционирование этих образов в сценарии документального короткометражного фильма «Свидетели вечности», созданного В. Короткевичем, а также отношение писателя к проблемам окружающей среды, зафиксированное в его частных письмах.

***Ключевые слова***: краеведение; деревья-памятники природы; экологическая проблематика; патриотический пафос; киносценарий.

# GIANT TREES OF BELARUS IN THE LOCAL FAMILY SCREENPLAY «WITNESSES OF ETERNITY» BY VLADIMIR KORATEVICH

**V. V. Navitskaya**

*Master of Philology,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus,*
*strahlbox@gmail.com*

The article reveals the peculiarities of the functioning in the artistic world of U. Karatkevich of the images of unique monuments of Belarusian nature – centuries-old giant trees from Turov, Novogrudok, Svityaz, Voroncha, Tuganovich, Shchorsau, etc. The author characterizes the writer's understanding of the existence of old-growth trees in the context of distant historical time and at the end of the 20th century. The positioning of these images in the script for the documentary short film «Witnesses of Eternity» created by U. Karatkevich is determined, as well as the writer's attitude to the problems of ecology, recorded in his private letters. Keywords: local history, trees-monuments of nature, ecological issues, patriotic pathos, film script.

***Keywords***: local history; trees-natural monuments; ecological issues; patriotic pathos; film script.

Паэтычна-творчую душу Уладзіміра Караткевіча захапляла ідэя раскрыць народны характар і прыроднае хараство Беларусі праз лёс, быццё і гістарычную памяць яе прыроды, у тым ліку – старых дрэў.

Амаль на пачатку літаратурнага шляху, у 1960-я гады, У. Караткевіч пранікся і думкай, і словам мастацкім, і ўласцівай яму відушчасцю з нагоды таго, што найперш нашы лясныя абшары фарміравалі характар беларуса, яго знешняе аблічча і душу. Напрыклад, у раздзеле «Зялёны шум» (кніга «Зямля пад белымі крыламі») аўтарам вызначаны асноўныя рысы характару беларуса, выхаваныя лесам. Перш за ўсё, беларус прывучаны быць уважлівым да самых звычайных дробязей жывога – прыроднага – асяроддзя. Лес сфарміраваў, на думку аўтара, і такія праявы беларускага характару, як рамантычнае ўспрыманне ляснога свету, што абумовіла «фантастычную» мройлівасць і здольнасць быць спакойна-разважлівым і храбрым у складаных жыццёвых абставінах. Лес не толькі карміў, лячыў, бараніў ад напасцяў, але і сам пераносіў тыя нягоды, што выпадалі на долю народа. Прыгадваюцца аўтарам эсэ вершаваныя радкі В. Зуёнка пра падсочку сталых сасновых дрэў як пра жорсткасць да жывога. Рабрыстыя шнары на іх целе асацыятыўна нагадалі паэту прыдуманы для дрэў Майданак. Спачувальна прамовіць У. Караткевіч: «І з хат

знікаў смольны дух, і глуха пелі цымбалы з абяскроўленага дрэва» [1, с. 248].

Загадкі, сакрэты, таямніцы жыцця айчынных лясоў цікавілі творцу і як паэта, і празаіка, і кінасцэнарыста. Так, летам 1964 года разам з супрацоўнікамі «Беларусьфільма» У. Караткевіч браў удзел у здымках кароткаметражнай стужкі «Сведкі вечнасці» па ўласным сцэнарыі. Задума ўвасобілася ў кароткай, але глыбокай кінастужцы – яшчэ чорна-белай, на рускай мове; у здымачную групу ўвайшлі: рэжысёр-аператар А. Забалоцкі, музычнае афармленне – А. Янчанка, гукааператар – М. Ведзянееў, рэдактар – Л. Фадзеева, вытворчасць Мінскай студыі навукова-папулярных і дакументальных фільмаў (у сеціве гэтая стужка пададзена, зразумела, з лагатыпам «Беларусьфільма», яе хранаметраж без сучаснай рэкламы складае ўсяго 10 хвілін, таму нядзіўна, што У. Караткевіч шырока разгарнуў узнятую тэму ў сваёй пазнейшай творчасці). Вось што паведамляў пісьменнік пра рэалізацыю сваіх сцэнарных ідэй украінскаму навукоўцу і педагогу Аляксандру Адрыянавічу Назарэўскаму: «Будет такая небольшая философско-поэтическая вещь: деревья-свидетели, деревья-организмы, деревья-государства» [2, с. 69]. Паведае і пра тое, як разам з аператарам і шафёрам калясілі па краіне: Навагрудак, Свіцязь, Варонча (сустрэча з дубам, якому 800 год). Прывіталі старажытныя ліпы ў Туганавічах, наведалі альтанку Марылі Верашчака. У Шчорсах здымалі алею 250-гадовых ліп і дуб «Гражыны». Па дарозе з Любчы ў Навагрудак выпала сустрэча з Таполяй Напалеона. Пазней быў азёрны край пад Полацкам. Дабраліся па часе і да знакамітага Цар-Дуба – тысячагадовага «дуба Крывашапкі», шлях да якога пралёг праз Мазыр, Лельчыцы і вёску Данілегі (Данілевічы). Так схематычна ў лісце ад 19 чэрвеня 1964 года акрэслены У. Караткевічам маршруты іх здымачнай групы да старажытных прыродных волатаў.

Матэрыял нарэшце сабраны. Засталося належным чынам апрацаваць. Але ўзніклі свае складанасці: давялося пераадольваць самога сябе, свой эмацыянальна-псіхалагічны стан. Пісьменнік быў крайне ўзрушаны тым, што ўбачылася ў час вандравання. Як жа часта неабачліва, неразумна, без вострай патрэбы рабуе грамадства прыродныя абшары. Балючыя думкі пранізваюць ліст пісьменніка А. Назарэўскаму ад 15 верасня 1964 года: «Начал я работу над этими “деревьями” и, в процессе работы, расстроился. Такое идёт оскудение лесами, травами, землёй. Вырубают, как, ты скажи, необходимо двум-трём поколениям шкуру содрать с земли. Прямо дикое что-то. Мол, на нас хватит» [2, с. 72]. Чуем гаркотныя словы роздуму пра будучыню зямлі, краіны, народа, калі так прагна, похапкам глытаецца ўсё, што павінна застацца бясцэнным скарбам для наступных стагоддзяў: і травы, і воды, і лясы, і шматвяковыя дрэвы. Дрэвы-манументы. Дрэвы-помнікі. Не раз пашкадуе

У. Караткевіч, што няма строгіх, нават суровых законаў, якія засцерагалі б старажытна-гістарычнае мінулае, годнае і вялікае, дасканалае і прыгожае, ад нячыстых рук і памаўзлівых жаданняў.

Работа над увасабленнем сабраных матэрыялаў сродкамі дакументальнага кіно паўплывала на думку, што магчымасці кароткаметражнай дакументальнай стужкі, нават калі яна будзе ў дзвюх частках, усё ж абмежаваныя. Не атрымаецца ўключыць у кантэкст фільма ўсё багацце вандроўных уражанняў у час «візітаў» да волатаў-старажылаў. Не адпускала душу пісьменніка ўбачанае, перажытае: карціны, малюнкі, колеравыя тоны і паўтоны, жывыя галасы і гукі, неверагодныя сітуацыі, якія ўзнікалі ў час падарожжа ў стагоддзі. Думаецца, натуральным было рашэнне У. Караткевіча ўвасобіць свае думкі-развагі, эмацыянальна-пачуццёвую рэакцыю на многае, што абурала, захапляла і нават смяшыла, у мастацкае слова.

У 1968 годзе часопіс «Маладосць» (№ 12) вынес на суд чытача эсэ У. Караткевіча «Дуб Крывашапкі». Праз два гады твор быў апублікаваны пад назвай «Дрэва вечнасці», з пазначэннем жанру як аповесці-эсэ. У каментарыі Пятра Жаўняровіча да апавядання «Дрэва вечнасці» ёсць цікавая інфармацыя наконт таго, што аўтар меркаваў удакладніць жанравую форму, працуючы над эсэ «Дуб Крывашапкі». Аказваецца, рукапіс твора меў падзагаловак «Апавяданне аб падарожжы ў стагоддзі». Увага навукоўца звернута на апошнюю старонку рукапісу: у канцы тэксту курсівам змешчана пазнака – «12 лютага 1966 г. Рагачоў» [1, с. 730].

У пошуках шматсотгадовых сведкаў мінуўшчыны, спасціжэння іх зносін з акаляючым светам ва ўсе вякі іх існавання Уладзімір Караткевіч дападаў у тыя мясціны нашай зямлі, дзе можна было рэальна адчуць дыханне прамінулых эпох і на свае вочы пабачыць дзівосных волатаў-старажылаў. І такім месцам для яго стала Палессе… Там чакала сустрэча з тысячагадовым дубам. Якраз Цар-Дуб і павінен быў стаць апошнім і самым значным кадрам дакументальнай стужкі. Паездка здымачнай групы ў Палессе «насустрач стагоддзям» прынесла шмат нечаканага, незвычайнага. Творца прызнаецца, што «ў другіх паездках было лягчэй, а тут мы намучыліся, як грэшныя душы ў пекле. На схіле дзён я раскажу аб пачатку гэтай паездкі ў Палессе падрабязна» [1, с. 75].

Гадзінамі ехалі лясамі, а яны былі старыя і гордыя сваім узростам. Былі толькі лясы, і ніякіх прыкмет цывілізацыі. Вакол цішыня. Нават рэчкі лясныя краліся ціха-ціха, каб «не разбудзіць якога-небудзь паўмёртвага ляснога патрыярха» [1, с 76]. Адзначыць не толькі пароду дрэў, але і штосьці адметнае, непаўторнае ў іх абліччы: чорныя вольхі ў два абхваты, грабы і хвоі ў абдымках, дзічкі, адначасова падобныя на дубы і на зялёныя хмары. На палову неба.

Ёсць у апісаннях аўтарам беларускіх лясоў і пафас рамантычнага захаплення, і рэалістычная канкрэтыка, дакладнасць ва ўсім. Празаік XX стагоддзя асцярожна дакранецца да міфалагічных уяўленняў старажытных прашчураў. Патлумачыць, чаму нашы продкі пакланяліся дубу і дзічцы: «Лічылі, што жывуць у іх гордыя душы палескіх мужчын і пяшчотныя душы мясцовых жанчын, ледзь не самых прыгожых ва ўсёй Беларусі» [1, с. 76]. Быў уражаны і тым, што старажытныя веліканы яшчэ раслі. Разам з імі раслі і пакаленні палешукоў-бортнікаў: часта на дубах можна было ўбачыць пяць – шэсць калод-борцяў для пчаліных сем'яў. Так праз стагоддзі фарміравалася культура беларускага ляснога бортніцтва.

У лесе пісьменнік заўсёды чуйны, пільны, уважлівы. Пад тымі дубамі, ліпамі, грабамі быў сваім, а таму і адчуваў дыханне продкаў. У пошуме лістоты чулася яму старажытнае слова, зменлівае і вечнае. У парыве эмацыянальна-паэтычнага катарсісу на адным дыханні выдыхне: «Палессе! Ты ўсё – бясконцая і вечная паэма. Кожная лясная рэчка твая – драмлівы рэчытатыў ліры. Кожнае тваё ўрочышча – урачысты хор магутных галасоў. Кожнае дрэва тваё – Песня Песняў. Кожная галіна пад ветрам – неўміручы радок. І кожны свепет на дзічках тваіх – ода гэтаму вялікаму небу, на якім зараз ласкавыя і чыстыя адцені вечара. І пад гэтым небам мы ехалі ў стагоддзі» [1, с. 76].

Ведаючы пра здольнасць У. Караткевіча трапляць у рэальным жыцці ў розныя нечаканыя здарэнні, мы прадчуваем, што падарожжа ў стагоддзі не можа абысціся без незвычайных прыгод задоўга да сустрэчы творцы з тысячагадовым волатам. Спачатку выпадковая на беразе Прыпяці сустрэча са знаёмымі кіношнікамі: павінны здымаць пушчанскія лясы з удзелам ладнаватага мядзведзяняці. Успомнілася і колішняя гісторыя з падарункам (як ганаровым гасцям) рукі муміі. Збянтэжаны стан кожнага з кіношнікаў прымусіў адмовіцца ад падарунка і вярнуць яго гаспадару.

На шляху да Цар-Дуба яшчэ не раз душа творцы сустрэнецца з велічнай і гарманічнай дасканаласцю, разлітай ва ўсім наваколлі. Тысячагадовага волата наведалі двойчы. Спачатку вырашылі разведаць дарогу, каб назаўтра без перашкод пачаць здымачны працэс. Мясцовы дзед аказаўся дасведчаным праваднікам. Дуб-велікан раскашаваўся ў акружэнні пушчанскага ляснога царства і панавання адпаведнай эмацыянальна-вечаровай настраёвасці. Узнікла адчуванне глыбокай старажытнасці і даўно прамінулых часоў: «Як глуха! Якая закінутая журба! Быццам і не было ні кіеўскіх князёў, ні Ванькі Крывавага, ні Пятрухі-Мучыцеля» [1, с. 82]. Над усімі і ўсім – халодны небасхіл і першая на ім крынічная зорка. І сюды, пад залаты іканастас захаду, прыйшлі людзі – яны, кіношнікі. І раптам, нечакана, убачыўся ён, дуб Крывашапкі, які

быў «вышэй за ўсе дрэвы. <…> Стройны, як калона, у мноства абхватаў ля зямлі, усё раўнейшы і танейшы ўгору, дасканалы ў сваёй велічнай зграбнасці стаяў сярод лесу, сярод сыноў сваіх, унукаў, праўнукаў, далёкіх нашчадкаў лясны волат» [1, с. 83]. Ведаў, памятаў дуб і сваю радаслоўную. Час схаваў сляды таго волата, ад жолуда якога нарадзіўся будучы тысячагадовы волат. Бацька ягоны жыў, магчыма, у часы Цэзара і Скарыны, Хрыста і Нерона, Атылы і Катула.

Як жывая істота, дуб у Караткевіча здольны не толькі помніць, але і думаць. Неяк задумаўся аб неўміручасці, вечнасці. Зусім нечакана нават для самога сябе. Жолуд даў яму жыццё, а далей усё ішло так, як уладкаваны прыродны свет, як уладкавана чалавечае жыццё. Маленькі парастак, які прадзюбнуў зямлю, вылюднеў, хоць і чакалі яго тысячы бедаў, як і звычайнага маленькага чалавечка, якому суджана стаць часткай грамадства і яго гісторыі.

Роздум над лёсам волата-дуба прымушае аўтара задумацца і над тым, якое імя будзе найбольш адпавядаць сутнасці тысячагадовага быцця велікана: «Цар-Дуб», «Дуб Крывашапкі»? Усё не тое. Кожнае з іх варта жалю перад гэтай магутнай вечнасцю. Ён быў сведкам усёй пісанай нашай гісторыі. Сведкам канца радавога ладу, сведкам з'яўлення князёў і ўвядзення хрысціянства, сведкам разгрому беларусамі татарскай навалы, сведкам паўстанняў сямнаццатага стагоддзя і сведкам апошняй вайны. Нязмушана выспела імя незвычайнага сведкі – Вечнае Дрэва.

Знаёмства з Вечным Дрэвам і яго сям'ёй-дубровай прыводзіць аўтара да катэгарычнай высновы: «Так, гэтай дубровы нельга пілаваць ні ў якім разе. Патрэбен закон. Ніякая выгада не заменіць тут вялікай страты» [1, с. 85].

Новы дзень пачаўся новай (ужо здымачнай) сустрэчай з дрэвам-сведкам. Хацелася спасцігнуць вышынную таямніцу дрэва, але дасягнуць яго вяршыні было немагчыма. Не дазваляў роўны, як калона, ствол, а яшчэ маленькае, на самай верхавіне, дупло – дзікі пчаліны свепет (вісячы вулей). «Яго ніхто не мог дастаць. Дзед сказаў, што свепет там быў яшчэ ў гады ягонага дзяцінства» [1, с. 85]. Сама прырода, здаецца, ахоўвала выносную вяршыню дрэва.

Не праміне Караткевіч-апавядач яшчэ раз сказаць і пра вандалізм: як людзі розных узростаў і прафесій пакідаюць «сляды» свайго «візіта» да волата: надпісы здымаюць з кары, а яны ўпарта паяўляюцца зноў. Гэты боль неаднойчы перажыў дуб-старажыл. Развітанне з волатам было незвычайным. Пакуль група здымала новы цікавы прыродны аб'ект (двуногі дуб), апавядач пешшу ўжо вярнуўся да свайго ўлюбёнца. «Белы, ён стаяў у змроку, думаў пра нешта, а зямля кадзіла яму.

У-у, якая вечная, якая жывая стаяла вакол яго цішыня! І я стаяў і, няверуючы, пагаварыў з ім у думках, ціха памаліўся яму і папрасіў аб

самым дарагім» [1, с. 87]. Гэтае развітанне з унікальным дрэвам было і кранальным, і павучальным: да святыняў не ідуць з апусцелай душой і бяздумнай галавой. Думай, сучаснік, гавары, сэрцам прамаўляй, маліся, адчуваючы жывую цішыню і высокую святасць. Цяпер назаўсёды Вечнае Дрэва стала крыніцай духоўнага ўзвышэння і мастацкай прыкутасці пісьменніка да таго, што трэба рабіць, каб тысячагадовы сведка дажыў да свайго другога тысячагоддзя як жывое ўвасабленне «ўсёй нашай пісанай гісторыі, усіх учынкаў нашых і ўсіх беларускіх жыццяў, што прайшлі за нашу гісторыю па твары зямным» [1, с. 89].

Сапраўды, канкрэтыка, факталогія, багацце думак надзвычайныя. Пісьменнік думаў, як зрабіць, каб не заворваліся прыпяцкія паплавы, не заворвалася паша, каб лясы, і запаведнікі ў тым ліку, не станавіліся выпасам для жывёлы, бо знішчаўся падлесак, а гэта будучыня дубоў-волатаў. Доказна выбудоўваецца паралель: грамадства краіны і грамадства спрадвечных дуброў: «Як бы вы паглядзелі на грамадства, якое, дбаючы аб сільных мужах і мудрых старых, зусім бы не дбала аб дзецях. Старыя мудрацы ў такім грамадстве вымерлі, сталыя састарыліся б і памерлі таксама. І ніхто не заняў бы іхняга месца. І грамадства такое было б аддадзена тлену, асуджана на смерць.

Такое грамадства – прыпяцкія пойменныя дубровы» [1, с. 409].

Паводле твораў Уладзіміра Караткевіча, у якіх цесна пераплецена гісторыя быцця карказломных дубоў-волатаў, спрадвечных дуброў і велічна-годная нацыянальная гісторыя, можна было б выпрацаваць адмысловы звод запаветаў, скіраваных на ахову годнай і велічнай нашай мінуласці, на абарону прыроднай зямной дасканаласці. Такая інтэнцыя прысутнічае ва ўсім краязнаўчым змесце і пафасе апавядання-эсэ У. Караткевіча «Дрэва вечнасці» (першая назва «Дуб Крывашапкі»), а таксама ў кінасцэнарыі «Сведкі вечнасці», што папярэднічаў названаму эсэ і аднайменнай кінастужцы.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Караткевіч У.* Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч; падрыхт. тэкстаў П. Жаўняровіча; рэд. тома В. Іўчанкаў. Мінск: Маст. літ., 2016. Т.12: Публіцыстыка. Эсэ-нарысы: 1952 – 1982. 494 с.

2. *Караткевіч У.* Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч: падрыхт. тэкстаў, камент. Я. Будовіч [і інш.]; рэд. тома А. Бельскі. Мінск: Маст. літ., 2022. Т. 20: Лісты: Частка 2. 367 с.